# Падрыхтоўка аб'явы аб пошуку працы

Data publikacji: 29.09.2019 Data modyfikacji: 29.09.2019 Departament Rynku Pracy MRPiPS

Эфектэўным спосабам знайсці працу можа быць падрыхтоўка ўласнай прапановы. Вы можаце прадаставіць яе непасрэдня наймальніку, размясціць ў прэсе альбо на дошцы аб'яў. У большасці газет і інтэрнэт-сайтаў Вы можаце зрабіць гэта бесплатна.

**Аб'ява, размешчаная ў прэсе** альбо на дошцы аб'яў павінна змяшчаць наступныя звесткі:

- Хто шукае працу?
- Якую працу шукае?
- Як можна з ім скантактавацца?

Прапанова, размешчаная ў прэсе патрабуе вельмі скарочанай формы.

**Амбіцыйны, прафесійны бухгалтар шукае працу, тэл:222 111 000**

**Аб'ява, размешчаная на дошцы аб'яў** можа быць крыху шырэйшую форму, але яна таксама павінна быць кароткай і камунікатыўнай:

**Амбіцыйны, прафесійны бухгалтар з навыкамі вядзення бухгалтарскіх кніг даходаў і выдаткаў, навыкамі працы з камп'ютэрам і праграмамі Symfonia і Płatnik, шукае працу у фінансавым і кадравым аддзелах.**
**тэл .: 223 110 001**

**Аб'явы можна размяшчаць:**

- на агульна даступных дошках аб'яў,
- на часных дошках інфармацыйных агенцтваў,
- у іншых вызначаных месцах.

**Сваю прапанову аб працы можна адправіць:**

- поштай,
- электроннай поштай,
- падаць асабіста.

**Прапанова, якая падаецца да наймальніка, павінна быць:**

- чытэльнай,
- кароткай, канкрэтнай
- акрэсліваць Вашы навыкі
- быць звязанай з пасадай, на якую Вы прэтэндуеце.

## Як адправіць e-mail?

- Карыстаецеся сваім адрасам электроннай пошты, які змяшчае Ваша імя і прозвішча
- Дадайце аплікацыйныя дакументы
- Выкарыстоўвайце прынцып: адзін e-mail аднаму наймальніку
- Складзіце кароткую інфармацыю аб тым, чыму Вы пішаце, што адпраўляеце і як можна з Вамі скантактавацца
- Памятайце аб фармальнай мове і афіцыяльных зваротах

Прыклад e-mail:

*Шаноўны Спадар/Спадарыня*

У адказ на аб'яву, размешчаную на сайце www.pracuj.pl адносна рэкрутынгу на пасаду гандлёвага прадстаўніка, № рэф. 324 я адпраўляю свае аплікацыйныя дакументы. Я зацікаўлены працай дадзенага тыпу і адпавядаю асноўным патрабаванням (адукацыя ў галіне гандлю, вадзіцельскае пасведчанне, навыкі весці перамовы).

Калі Вы вырашыце, што я з'яўляюся адпаведным кандыдатам на прадастаўленную пасаду, калі ласка, звяжыцеся са мной па тэлефоне: 821-412-003 ці па электроннай пошце.

*З паважаннем*
*Ян Незбендны*